УДК 004.588:37.018.43:378

Н.С. Шакун, дац.
(БДТУ, Мінск)

# ЭФЕКТЫЎНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ АДУКАЦЫЙНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ MOODLE У СІСТЭМЕ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ СТУДЭНТАЎ

Праграма Moodle (Modular Object-Oriented Dynamic Learning Environment) – гэта так званая сістэма кіравання курсамі, ці, іначай кажучы, від электроннай адукацыйнай платформы, якая актыўна выкарыстоўваецца ў сістэме дыстанцыйнага навучання (СДН). Існуюць розныя рэсурсы такога роду, напрыклад, BlackBoard, ILIAS, ATutor і інш., але Moodle з'яўляецца на сённяшні дзень найбольш засвоенай і самай папулярнай у беларускай сістэме адукацыі. Так, свае дыстанцыйныя рэсурсы трымаюць на пляцоўцы Moodle БДПУ, БДАТУ, БДУ, ВДУ, ГДАУ, МДУ і інш.

Moodle – сапраўды, даволі зручная, не складаная ў эксплуатацыі, дынамічная і шматфункцыянальная праграма. Яна мае шэраг пераваг перад іншымі падобнымі рэсурсамі. У прыватнасці, папулярная ў Амерыцы праграма BlackBoard мае менш магчымасцяў у параўнанні з Moodl'ам. Калі мы кажам пра любую праграму для дыстанцыйнага навучання, нас найперш цікавіць: 1) якія яна мае магчымасці па абмене і захаванні файлаў рознага фармату, а таксама баз дадзеных; 2) наколькі абмежавана прастора кожнага асобнага ўдзельніка.

BlackBoard, больш простая ў эксплуатацыі праграма, змяшчае зручны каталог курсу, зручная для правядзення тэставых заданняў з таймерам і магчымасцю праводзіць аўтаматычнае ацэньванне працы студэнта, але яна не мяркуе калектыўных чатаў, не разлічана на адкрытыя відэа-заняткі, не дазваляе захоўваць у асобных архівах усе матэрыялы курсу. Такім чынам, студэнт на такой пляцоўцы больш абмежаваны і больш пасіўны. Гэтая праграма скіравана на камунікацыю "т'ютар – навучэнец".

Moodle арыентавана не толькі на індывідуальную камунікацыю паміж студэнтам і настаўнікам, але і на форум, на групавыя формы навучання, што надзвычай важна. Асноўныя моцныя інструменты праграмы:

1) менеджар ацэньвання студэнцкага ўдзелу – сістэма аўтаматычнага вылічэння бала;
2) спіс удзельнікаў / менеджар наведвання пляцоўкі;
3) дыскусійныя форумы;
4) рабочы каляндар (тайм-менеджар);

5) накіраванасць на супрацоўніцтва ўсіх бакоў адукацыйнага працэсу;

6) файла-абменнік, цудоўныя магчымасці па захаванні файлаў вялікага аб'ёму;

7) унутраны абменнік прыватнымі паведамленнямі, чаты, wikis.

Такім чынам, праграма Moodle – больш апраўданы выбар, калі вы зацікаўлены ў стварэнні адукацыйнай пляцоўкі для калектыву, для групы слухачоў, якія будуць не толькі індывідуальна атрымліваць інфармацыю пра курс, але і вучыцца актыўна ўзаемадзейнічаць з іншымі саўдзельнікамі, абмяркоўваць працоўныя пытанні на адкрытых форумах. Для гэтага вельмі важна задзейнічаць такую форму заняткаў, як wikis. Wikis – гэта форум адкрытага фармату для пэўнай групы ўдзельнікаў, кожны з якіх робіць свой унёсак у абмеркаванне праблемнага пытання па тэме курсу, як правіла, сфармуляванага настаўнікам (т'ютарам) загадзя і выстаўленага ў анонс у якасці будучай анлайн актыўнасці. Кожны студэнт удзельнічае ў агульным абмеркаванні, але мае магчымасць стварыць і сваю ўласную галіну ў агульным дрэве форуму. Такі адукацыйны інструмент, як wiki-форумы, дае магчымасць настаўніку не толькі сфарміраваць уяўленне пра здольнасць кожнага асобнага студэнта адказваць карэктна на пытанні і развіваць свае разважанні ў сістэме "тэзіс – аргументаваны доказ – ілюстрацыя – выснова", але і спраўдзіць аўтарства выкананых папярэдне ў курсе заданняў (паколькі адкрытыя жывыя форумы кшталту wikis істотна зніжаюць рызыку выкарыстання плагіяту).

Такім чынам, віртуальнае навучальнае асяроддзе Moodle мае дастаткова магчымасцяў і інструментаў для рэалізацыі эфектыўнага адукацыйнага працэсу, а таксама для стварэння аб'ектыўнай карціны здольнасцяў кожнага слухача і адэкватнага ацэньвання яго актыўнасці ў курсе.

ЛІТАРАТУРА

1. Moodle. Official site. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://moodle.org/ Дата доступу: 30.01.2018.

2. Moodle vs BlackBoard – that is the question. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://www.ispringsolutions.com/blog/moodle-vs-blackboard/ Дата доступу: 30.01.2018.